**Нематэрыяльная гісторыка-культурная каштоунасць**
**"Традыцыйныя вобразы і тэхналогія вырабу гліняных народных цацак-свістулек Магілёўскага Падняпроўя ў Магілёве і Крычаве"**

Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 11 студзеня 2023 г. быў нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці элементу "Традыцыйныя вобразы і тэхналогія вырабу гліняных народных цацак-свістулек Магілёўскага Падняпроўя ў Магілёве і Крычаве" і ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

28 снежня ў Міністэрстве культуры адбылося паседжанне Рады. Удзельнікі студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свістулька» (г.Крычаў) і «Чароўная гліна» ляпілі цацкі, свісталі ў іх. Удзельнікі «Вашчылак» таксама прадстаўлялі ў сваіх выступах падняпроўскую цацку.




Як адзначыў археолаг Андрэй Мяцельскі, толькі на Крычаўшчыне выраблялася цацка-свістулька "Крычаўскі конь". Гэта архаічны выраб, які складаецца з галавы каня і тулава качкі (яе яшчэ называюць «качка-конь»), і яна з'яўляецца брэндам Крычава і сімвалам рэгіянальнага фестывалю «Крычаўскі канёк».



Народны майстар Крычаўскай зямлі Вячаслаў Мікалаевіч Якавенка стаў адным з першых, хто пачаў ствараць Падняпроўскія цацкі на Крычаўскай зямлі і працягвае традыцыю стварэння гэтай цудоўнай цацкі да цяперашніга часу.











Вячавлаў Мікалаевіч дасягнуў значных поспехаў у кераміцы. У працэсе самастойнай творчай працы адрадзіў Падняпроўскую цацку-свістульку і ганчарства на Крычаўшчыне. У сваім рамястве майстра абапіраецца на мясцовыя, рэгіянальныя і нацыянальныя традыцыі, творча іх перапрацоўвае, развівае і далучае да іх дзяцей, падлеткаў і дарослых. Вядзе плённую і мэтанакіраваную работу па эстэтычнаму і духоўнаму выхаванню дзяцей і дарослых, навучае іх прафесійнаму майстэрству. Прымае актыўны ўдзел у мерапрыемствах, святах, конкурсах, фэстах. Стварае ўнікальныя, непаўторныя ўзоры і папулярызуе Падняпроўскую гліняную цацку-свістульку, рэдкія музычныя інструменты. Вядзе навуковую, метадычную і творчую дзейнасць, якая атрымала прызнанне ў Беларусі і па-за межамі краіны. Уносіць уклад у развіццё міжнароднага супрацоўніцтва і папулярызацыю беларускай культуры і мастацтва. Стварае каштоўныя мастацкія творы, якія з’яўляюцца ўзорамі ў выхаванні насельніцтва, сімваламі Беларусі ў іншых краінах. Работы народнага майстра знаходзяцца ў музеях і прыватных калекцыях Расіі, Беларусі, Нідэрландаў, Чэхіі, Нарвегіі, Швейцарыі, Японіі, Малдовы, Турцыі, Англіі, Германіі, Літве, Туркменіі, Польшчы.





# Гісторыя Падняпроўскай цацкі-свістулькі

Падняпроўская гліняная цацка-свістулька – гэта ручны выраб з гліны, прызначаны для атрымання свісту, розных гукаў і выконвання мелодый. На іх можна імітаваць спевы птушак, гукі жывёлін і звяроў. У старажытнасці арэал распаўсюджвання падняпроўскай глінянай цацкі – гэта тэрыторыя Верхняга Падняпроўэя, на якой жылі плямёны мілаградскай, юхнаўскай і днепра-двінскай археалагічных культур. Прыкладныя кропкі межаў іх заселенасці гэта: на поўначы – г. Асташкаў (Цвярская вобласць), на ўсходзе - г. Вязьма (Смаленская вобласць), на поўдні – г. Чарнобыль (Чарнігаўская вобласць), на захадзе - г.п. Крупкі  (Мінская вобласць).

У X-XII стагоддзях на гэтай тэрыторыі ў большасці пражывалі радзімічы і смаленскія Крывічы. Цацка Магілёўскага Падняпроў'я  да 1917 года складалася з рэгіянальных і лакальных ганчарных цэнтраў, дзе яна і выраблялася. Гэта такія цацкі як: бабінавіцкая, дубровенская, зімонінская і іншыя, якія выраблялісь ў дробных мястэчках і вёсках.

Адрадзіў Падняпроўскаю цацку ў 1995 годзе Народны майстар Рэспублікі  Беларусь, член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці – Вячаслаў  Мікалаевіч Якавенка. За адраджэнне Ўсходне - славянскай,  Падняпроўскай народнай традыці глінянай цацкі ў 2014 годзе ў Маскве, ён быў узнагароджаны ордэнам “Пашана і слава”. Майстар і цацка занесены ў Міжнароднаю энцыклапедыю. В.М.Якавенка стварыў два самадзейных калектыва, якія атрымалі званне “Народны”  “Свістулька” (1999 г.) і “Добрасці” (2013 г.). З 2000 па 2022 гг. у іх працавала тэхнікам і кіраўнікам Народны майстар Рэспублікі Беларусь, член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці – Яшчанка Любоў Міхайлаўна. Яна вучыла дзетак і дарослых вырабу Падняпроўскай цацкі.

Сучаснае месца бытавання Падняпроўскай глінянай цацкі гэта – г. Магілеў,студыя “Чароўная гліна”, кіраўнік Яшчанка Любоў Міхайлаўна і г. Крычаў – дзіцячая “ўзорная” студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Свістулька”, кіраўнік Якавенка Вячаслаў Мікалаевіч.

Вытокі свістулек ідуць ад гліняных фігурак, якія неслі сакральныя функцыі. Падняпроўска цацка-свістулька адрозніваецца ад цацака інўых рэгіёнаў сваёй архаічнасцю, асаблівасцб і адметнасцю, традыцыйнымі формамі, непаўторнасцю вобразаў, трактоўкай сімвалаў і тэхналогіяй вырабу. Цацка вельмі дасканалая, малых памераў, без вострых выступаў, дробязей, абагуленая і зручная ў руцэ. Яна так і патыхае старажытнасцю! Толькі ў Падняпроўскай глінянай цацкі ёсць такія вобразы і формы, якіх няма ў іншых рэгіянальных цацках больш нідзе ў свеце. Яна адразу кідаецца ў вочы і вылучаецца сваёй вобразнасцю, умоўнасцю, пластычным лаканізмам, асаблівымі тэхналогіямі вырабу. З далёкіх архаічных часоў менавіта патомныя майстры ўсходняга Магілёўскага Верхняга Падняпроў’я, пераймаючы прыёмы лепкі і характар трактоўкі вобразаў, данеслі ў гліняных цацках, амаль да пачатку 80-х гадоў XX стагоддзя стылістыку, сімвалы, узоры, гукі і подых старадаўнасці.

Такія формы і вобразы агульнабеларускай цацкі-свістулькі як: птушка, качка, певень, конь, вершнік на кані, козлік (каза), баран(авечка), бык(карова), мядзведзь, дудачка, сабачка,вадзяны свісток “Салавейка” ў Падняпроўскіх вырабах маюць свае адметнасць і асаблівасці. Іх адразу можна вылучыць сярод іншых цацак.


Вершнік на кані, вершык на качка-кані


Баранчыкі


Козлікі

Але ж толькі на Магілёўскім Падняпроў’і існавалі такія формы і вобразы, якія не сустракаюцца больш нідзе. Гэта: качка-конь(птушка-конь), крычаўскі конь, вершнік на качцы, вершнік на качка-кані, коне-певень, сава. Такія ўнікальныя рэдкія вобразы парадзілі і новую трактоўку сімвалаў. Напрыклад: конь – сімвал сонца, агню і мужчынскай сілы, качка-сімвал ночы і мацярынства. Качка-конь абэядноўвае сімвалы качкі і каня, ахоўвае дзнём і ноччу. Певень – сімвал сонца, раніцы, плоднасці. Коне-певень абэядноўвае іх і сімвалізуе два сонца, перамогу славянства над язычніцтвам, таму што качка яшчэ і сівал фіна-вугорскіх народаў, а конь – славянства. Вершнік на качцы альбо качка-кані – гэта, спачатку Ярыла, потым святы Юрый, які ўжо ахоўвае зямлю і яе жыхароў дзнём і ноччу. Ён жа першы выходзіць на ралл’ю. Сава – сімвал мудрасці, ахоўвае жытло, затупніца жанчын. Унікальнай з’яўляецца цацка-свістулька Крычаўскі конь. Яна знойдзена архіёлагам А.Мяцельскім у пласце XVII стагоддзя і як ён адзначае выраблялася толькі ў Крычаве. Гэта архаічная цацка-свістулька мае галаву каня і тулава качкі. У пачатку 70-х гадоў XX стагоддзя на кірмашы ў Крычаве майстры-ганчары гандлявалі ёй разам з посудам. Цацка-свістулька Крычаўскі конь з’яўляецца брэндам горада Крычава. Яна стала сімвалам межрэгіянальнага фестываля, якія праходзяць у городзе Крычаве пад назвай “Крычаўскі канёк”



Вершнік на качка-кані



Коні-пеўні, акарыны-бразготкі



Коні-пеўні



Сава, вершнік на кані



Крычаўскі конь

У Крычаве захаваўся ганчарскі фальклор. Гэта: замовы, прымаўкі, песні і паданні. З XXI стагоддзя Крычаў вядомы як ганчары цэнтр дзе вырабляўся посуд і розныя глінянныя цацкі. Крычаўская цацка, у тым ліку і свістулька, з’яўляецца часткай падняпроўскай глінянай цацкі.



Совы, лялькі і коні



Сірынга. Парняты. Дудачкі. Брызгодка

Падняпроўская гліняная цацка-свістулька – гэта унікальная гісторыка-культурная спадчына і  каштоўнасць Рэспублікі Беларусь.